# “Маладосць”– летняя: мяняем партфель на саквояж



Ліпень – час падарожжаў. З гэтай прычыны часопіс маладых літаратараў “Маладосць” часова мяняе рэдакцыйны партфель на дарожную сумку, у якую збірае з усёй Беларусі (і нават па ўсім даступным замежжы) усё тое, што хоць нейкім чынам (хоць нават і ўскосна) адпавядае тэмам дарог і вандровак. Прымаем на адрасы нашых рэдактараў да 20 мая з мэтай надрукаваць у ліпеньскім нумары (у выпадку добрай якасці, канечне) наступныя б(д)рукаванкі:

- падарожныя нататкі (свае ці пераклады нечых чужых, нядаўнія ці гістарычныя),
- апавяданні і вершы (ад аўтараў ва ўзросце да 35 гадоў)
- вандроўкі любога кшталту – літаратурныя, кулінарныя, касмічныя, мікракасмічныя, “па слядах” і г.д. (аўтару самых незвычайных вандровак, прынятых да друку, абяцаецца прыз),
- гісторыі, пачутыя ў цягніках,
- думкі, якія ўзніклі ў дарозе,
- малюнкі, зробленыя падчас падарожжаў,
- іншае

Святлана Воцінава
Галоўны рэдактар часопіса "Маладосць"
РВУ "Выдавецкі дом "Звязда"
http://zviazda.by/be
8-017-284-85-24
8-029-149-87-93

МАЛА
ДОСЦЬ